Беларуская Дзяржаўная Бібліятэка арганізавана ў канцы 1921 г. Цяпер у ёй налічваецца да 300.000 томаў. Калі заўважыць на тое, што ў межах сучаснае БССР да рэвалюцыі зусім ня было салідных *кнігасхоўняў*, ня было нацыяналізаваных кніжных фондаў, з тае прычыны, што ўсякія кніжныя фонды тут зьнішчаліся фронтамі і акупацыямі ў часе вайны, дык арганізацыя на працягу 5 гадоў буйнае Дзяржаўнае Бібліятэкі зьяўляецца адным з важнейшых дасягненьняў культурнага будаўніцтва БССР.

Беларускі аддзел Бібліятэкі ўжо ў сучасны момант зьяўляецца буйнейшым назапашваньнем літаратурнага матар'ялу па розных пытаньнях, датычных вывучэньня Беларусі. У склад гэтага аддзелу ўвайшоў цэлы шэраг каштоўных калекцый да галіны беларусазнаўства: акадэміка Карскага, беларускага этнографа прафэсара Янчука, былага папячыцеля Віленскае Вучэбнае Акругі Карнілава, прафэсара Жуковіча і іншых.

Агульныя аддзелы Бібліятэкі таксама набылі шэраг спэцыяльных навуковых прац: прафэсара Случэўскага ў галіне права, прафэсара Ісаева па біялёгіі, Барысава—па матэматыцы, бібліятэка акадэміка Грота і г. д.

З 1922 году Бібліятэка атрымлівае абавязковы экзэмпляр друкаваных прац з усіх саюзных рэспублік.

Беларуская Кніжная Палата функцыянуе з 1924 г. і мае тую ж задачу, як і кніжныя палаты другіх рэспублік: прыёмка і разьмеркаваньне па кнігасхоўнях СССР абавязковых экзэмпляраў выданьняў друку БССР і іх бібліяграфічная рэгістрацыя. З 1925 году Палата выдае пэрыядычны орган Дзяржаўнае Бібліятэкі БССР „Летапіс беларускага друку“.